зьяўляецца сталым супрацоўнікам нашае часопісі, *просіць нас на гэтым месцы пераказаць перад беларускімі працоўнымі масамі яго рашучы пратэст проці гэтага ілжывага паклёпу на яго.*

Гэтак міф аб падачы грамадзянамі Астроўскім і Луцкевічам просьбы, каб польскі ўрад памілаваў Тарашкевіча, Рака–Міхайлоўскага і інш., *разьвейваецца.* А разам з тым валіцца і ўся хітра складзеная на гэткай ілжывай падставе тэорыя аб „нацыянал–фашыстах“, як Масква ахрысьціла беларускіх радыкальных дзеячоў[32]. А за ёй валіцца таксама і тэорыя аб „нацыянал–дэмакратызьме“ Жылуновічаў, Баліцкіх і іншых камуністаў–беларусаў, якія вінаваты адно тым, што цьвёрда верылі ў вызваляючую ролю камунізму адносна да ўцісканых чужацкаю ўладаю нацыянальнасьцяў. Сталін, імя якога ўжо зьвязана з ганебным фактам разгону ў Менску Ўсебеларускага Кангрэсу 31 сьнежня 1917 году, павёў *„новую нацыянальную палітыку“,* якая імкнецца *зрабіць рабамі чырвонае Масквы ўсе народы СССР,* і вядзе рашучую, непрымірымую барацьбу з усімі, хто можа станущь гэным плянам на перашкодзе, можа даць ім адпор. Карты Масквы раскрыты. Яна ўжо нікога не ашукае — хіба толькі тых, хто сам хоча быць ашуканым — дзеля матэрыяльнае ці іншае асабістае карысьці.

Ганьба такім!

## З Новым Годам!

Стары гэта звычай — абменівацца пажаданьнямі ў дзень Новага Году. І мы, выпускаючы гэты нумар у апошні дзень Старога Году, будзем вернымі гэтаму звычаю.

Чаго ж пажадаем мы нашаму народу, нашай вялікай сярмяжнай сям’і, зь якой кроўна ці ідэйна зьвязана і ўся беларуская інтэлігенцыя?

У мамэнт адыходу ў вечнасьць Старога Году сумны від мае наша грамадзкае жыцьцё. Зусім такі, які бывае пасьля нейкага страшнага пагрому. І калі, звонку гледзячы, можа здавацца чужому чалавеку, што ў нас „усё як у людзей“: і паслы ў Сойме засядаюць, і вось розныя культурныя ўстановы існуюць, ды мы сябе не ашукаем: усё гэта — адно толькі „фірмы“, толькі „вывескі“, за гучнымі назовамі якіх у большасьці выпадкаў няма ніякага зьместу...

Сяньня маем адвагу сказаць гэта публічна. Цяжкі крызіс перажыў беларускі рух у Заходняй Беларусі ад часу разгрому Грамады. Многа сіл змарнавалася. Шмат устаноў замерла ці мо заснула. І цэлыя галіны беларускага жыцьця аказаліся зусім неабслужанымі або абслужанымі блага й недастатачна.

Але — „мінае зьнемажэньня пара“[1]! Народ наш ад выбуху сусьветнае вайны і глыбокіх устрасеньняў, што раскатурхалі нашае жыцьцё, незвычайна *вырас духова.* Даволі параўнаваць тое, што было ў даваенныя і дарэвалюцыйныя часы, з тым, што прадстаўляе наша вёска і нашае места сягоньня, і сэрца расьце ад пачуцьця тэй *магутнай сілы духовай,* якую выяўляе сягоньня наш народ.

Хай цяжка нам сягоньня; хай цешацца нашы ворагі з таго ўнутранага разладу, які ўнясла чужацкая рука ў жыцьцё нашага грамадзянства ў Заходняй Беларусі; хай урэшце трыюмфуе — да часу! — маскоўскі нацыяналізм, які разьбівае вялікі культурны гмах беларускі ў БСРР, але ж усе гэтыя нягоды толькі дачаснае зьявішча. Збуджаныя зь векавечнага сну беларускія масы ўжо не заснуць нанова. Выяўленая імі творчая сіла залечыць нанесеныя ім раны і будзе ўсьцяж і ўсьцяж тварыць новыя культурныя цэннасьці і — *будаваць Беларусь.*

Мы бачым ужо праявы гэтага. Да нас даходзяць галасы з нашае вёскі — здаровы водрух цьвярозага розуму працоўных масаў на спробы варожых нам сілаў здушыць беларускі вызвольна–адраджэнскі рух, скрывіць нашы нацыянальныя і сацыяльныя ідэалы. Народ

ізноў пачаў варушыцца і кліча сваю інтэлігенцыю да творчае працы, да арганізоўваньня жывых сілаў вёскі і места.

Няхай жа ў гэтым Новым Годзе, што заўтра пачынаецца, нанова ўзьнімецца магутная хваля народнага руху — у імя нашага *нацыянальнага і сацыяльнага вызваленьня!* Няхай закіпіць ізноў наша творчая праца на ўсіх абшарах Зямлі Беларускае наабапал гранічнае мяжы, што разрэзала жывое цела нашае Бацькаўшчыны. І няхай пачуюць на ўсім сьвеце — свае і чужыя, што *жыве Беларусь,* што ўрэшце збудзіўся гаспадар яе, што

Беларускаю рукою
    Сьветлай праўды сіла
Славу лепшую напіша
    Бацькаўшчыне мілай![2]

Гэткія словы глыбокае веры й надзеі шлем сяньня ўсім нашым чытачом як навагоднее віншаваньне.